**Упраўленне культуры Гродзенскага аблвыканкама і Гродзенская абласная навуковая бібліятэка імя Я.Ф. Карскага аб'явілі сярод цэнтралізаваных бібліятэчных сістэм вобласці конкурс "Чытаем беларускую кнігу", які распачаўся яшчэ летась.**

Гродзеншчына: мультымедыя і прамоўшн

# Адкрываем і чытаем

У выніку актывізаваліся пошук і ўкараненне інавацыйных форм і метадаў работы, сучасных інфармацыйных тэхналогій, а таксама — распрацоўка доўгатэрміновых праектаў (супольна з іншымі арганізацыямі ды ўстановамі), якія накіраваны на павышэнне якасці і колькасці камплектавання бібліятэчных фондаў.

Высокай ацэнкі заслугоўвае работа Навагрудскай ЦБС, якая па выніках конкурсу атрымала дыплом I ступені. Супрацоўнікі падрыхтавалі праект "Адкрый для сябе беларускую кнігу", разлічаны на два гады. Бібліятэкары даследавалі склад і выкарыстанне беларускамоўнага фонду, зрабілі высновы, вызначылі асноўныя кірункі далейшай работы. Дзеці ж з ахвотай карыстаюцца электроннай гульнёй "Скарб — у кнізе, кніга — скарб", распрацаванай работнікамі ЦБ. Наладжана і шырокая рэкламная кампанія па папулярызацыі навінак беларускай літаратуры. Тут на дапамогу прыйшлі кіраўнікі аддзелаў райвыканкама, прадпрыемстваў і ўстаноў горада. Іх водгукі размешчаны на сайце ЦРБ і дошцы інфармацыі бібліятэкі.

У Лідскай ЦБС (уладальнік дыплома II ступені) распрацавана мэтавая праграма "Гартаючы каляндар": рыхтуюцца цыклы радыёгутарак "Бібліятэка ля мікрафона", прысвечаных юбілейным і памятным датам беларускага літаратурнага календара. Складнікам рэкламнай кампаніі сталі прамоўшн-акцыі: распаўсюджванне адмысловых лістовак-заклікаў да чытання. Не засталіся па-за ўвагай і жыхары аддаленых маланаселеных пунктаў. З дапамогай бібліобуса праводзілася акцыя "Беларускай кнізе — сельскі адрас". Вынікам плённай працы супрацоўнікаў Лідскай ЦБС стаў выпуск мультымедыйнага дыска "Чытаем беларускую кнігу". Дадзены матэрыял з'яўляецца добрым дапаможнікам пры правядзенні масавых мерапрыемстваў установамі культуры і адукацыі.

Трэці пераможца конкурсу (дыплом III ступені) — ЦБС Гродзенскага раёна, якая ажыццяўляе папулярызацыю роднай мовы і літаратуры пад час мерапрыемстваў з выкарыстаннем мультымедыйных прэзентацый і відэаролікаў ("Беларускія пісьменнікі — дзецям", "Паэт народа — Максім Багдановіч", "Чытаем беларускую кнігу" і г. д.). Праведзенае экспрэс-апытанне "Ці чытаеце вы беларускія кнігі?" паказала, над чым неабходна працаваць бібліятэкарам, якую літаратуру набываць, якіх аўтараў актыўней рэкламаваць.

**Надзея ДАВЫДЗІК,**
**загадчык аддзела бібліятэказнаўства Гродзенскай абласной навуковай бібліятэкі імя Я.Ф. Карскага**